**РЫЕР**
**Якаў Рыгоравіч**

Нарадзіўся ў 1947 г. Скончыў гістфак МДПІ. Доктар гістарычных навук, прафесар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта. Вывучае станаўленне і развіццё сярэднявечнага грамадства.




# СТАНАЎЛЕННЕ РАННЕСЯРЭДНЯВЕЧНАЙ ГАСПАДАРКІ ВА ЎСХОДНЯЙ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЕЎРОПЕ

Другая палова I тыс. н. э. – час заснавання падмуркаў развіцця еўрапейскіх цывілізацый. Звернемся да асаблівасцей гаспадарчай гісторыі і параўнаем два рэгіёны, якія пачалі сярэднявечча з аднаго ўзроўню, і насельнікі якіх мелі аднолькавы сацыяльна-эканамічны вопыт папярэдняга развіцця, знаходзіліся прыкладна ў аднолькавых натуральных умовах і практычна не ведалі староннягa ўплыву. Гаворка ідзе аб славянах (усходніх і заходніх) і германцах на ўсход ад Рэйна. Гэты абшар цалкам уваходзіць у лясную зону з прыкладна аднолькавымі ўмовамі для рассялення, паўсядзённага жыцця і гаспадаркі. Цэнтральная Еўропа адрознівалася ад Усходняй больш шчыльным рассяленнем і некалькі больш мяккім кліматам. Аднак да пачатку II тыс. характар размяшчэння насельніцтва і на ўсходзе, і ў цэнтры быў аднолькавы – у далінах рэк (1). Астатнія абшары былі ў большасці пакрыты лясамі і не выкарыстоўваліся ў асноўных галінах гаспадаркі тых часоў – земляробстве і жывёлагадоўлі. На ўсёй разглядаемай прасторы натуральнае асяроддзе заставалася стабільным.

ЗЕМЛЯРОБСТВА. Ва Ўсходняй Еўропе найбольш спрыяльныя ўмовы складаліся ў лесастэпе і паўднёвай ускраіне лясной зоны. Больш урадлівыя стэпавыя чарназёмы былі цяжкімі для тагачаснай тэхнікі, адзначаліся недахопам вільгаці і, галоўнае, былі вельмі прыцягальнымі для намадаў, што хвалямі пракочваліся праз Прычарнаморскія стэпы. Таму менавіта Сярэдняе Падняпроўе і стала месцам стварэння ўсходняга славянства. Там найбольш дынамічна развівалася мясцовая земляробчая культура.

Найбольш старажытным, як вядома, было падсечна-агнявое земляробства. Але ў лесастэпе ўжо з пачатку I тыс. н. э.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А ешова

яно пачало паступова выціскацца ворыўнай сістэмай, якая да VIII–X стст. стала там пануючай. У лясной зоне падсека захоўвалася значна даўжэй, а пры асваенні цаліны вядома і ў пачатку XX ст. Але як асноўны спосаб апрацоўкі глебы падсека праіснавала толькі да канца I тыс. Ужо ў VIII–IX стст., зыходзячы са знаходак жалезных прылад, земляробы пачалі засвойваць і ворыва. Аднак магчыма і раней бязлесныя асяродкі ў далінах, на палянах апрацоўваліся без дапамогі агню матыгамі ці прыладамі, якія рыхлілі ці скародзілі глебу, але не захаваліся. І гэты вопыт са з'яўленнем больш дасканалых ворыўных прылад садзейнічаў, відавочна, пераходу да больш прадукцыйнага ворыўнага земляробства, асабліва з X–XI стст. (2).

Такім чынам, калі ў лесастэпе ўменне араць глебу дасталося ў спадчыну з першай паловы I тыс., у лясной зоне першай формай ворыўнага земляробства можна лічыць лясны пералог, які ўзнік, хутчэй за ўсё, пры скарачэнні



Земляробныя прылады.
1 — рала, 2 — рала з полазам, 3 — рала з чарэслам, 4 — саха, 5 — плуг.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

часу адпачынку падсечных участкаў (у стэпе блізкай была залежная сістэма) (3).

Паступовае накапленне агратэхнічнага вопыту, удасканальванне ворыўных прылад і якасці апрацоўкі глебы пры скарачэнні свабодных зямель вялі да змяншэння часу "адпачынку" ўчасткаў пры пералогу ці залежы. Так адбываўся пераход да двухполля.

Аднак, як вядома, час утварэння папаравай сістэмы і тым больш з'яўлення двух- і трохполля прасачыць цяжка. У лесастэпе пачатак папаравай сістэмы адзначаецца з VIII–IX стст., у лясной зоне – з X–XII стст., дзе ягонае панаванне бясспрэчнае з XIV–XV стст. Але ў лесастэпавай зоне Ўсходняй Еўропы масавы пераход да трохполля мог пачацца і на рубяжы I/II тыс. (4).

Ў заходнеславянскіх землях на працягу VIII–X стст. таксама адзначаецца суіснаванне розных тыпаў земляробства з паступовым зжываннем падсекі і пашырэннем ворыўнай апрацоўкі глебы. Але да пачатку II тыс. адзначаецца перавага нерэгулярнага севазвароту – кароткатэрміновага пералогу (5).

У германскіх землях міжрэчча Рэйна/Мозеля–Эльбы да VI–VIII стст. таксама пераважала падсечна-агнявое земляробства. Але і тут у другой палове I тыс. паступова распаўсюджваюцца ворыўнае земляробства і севазварот (6).

Развіццё агрыкультуры ішло поруч са зменамі ў прыладах працы. Самым старажытным, як вядома, з земляробчых прылад было рала. Ва ўсходнеславянскіх землях з лесастэпу ў другой палове I тыс. яно пачало распаўсюджвацца ў лясную зону. У гэты перыяд, побач з вузкалязовымі раламі, якія толькі рыхлілі глебу, з'яўляюцца і шыроколязовыя. Іхнія пашыраныя жалезныя наральнікі ўжо злёгку падразалі пласт. У VI–VIII стст. у лесастэпе з'явілася рала з полазам, а хутка перад наральнікам пачалі ўсталёўваць чарэслы (плужныя нажы), што пераўтварала рала з полазам у падабенства лёккага плуга. Такія прылады вядомы на поўначы лесастэпу і на поўдні лясной зоны з VIII–X стст., а на поўначы – з больш позняга часу. Некаторыя даследчыкі лічаць іх плугамі. Але, здаецца, правы А.В.Чарняцоў, які даказвае, што адзнакай плуга з'яўляецца не чарэсла, а асіметрычны лемех. Прастата вырабленя, таннасць і лёгкасць рал розных тыпаў садзейнічалі доўгаму іх суіснаванню нават і пасля распаўсюджвання сапраўдных плугоў у XIII–XIV стст. (7).

Асаблівасці земляробства ў лясной зоне садзейнічалі з'яўленню сахі – прылады для рыхлення, як і рала, але больш зручнай на лясных глебах з тонкім гумусным слоем і шматлікім карэннем. З'яўленне сох у IX–XI стст. спрыяла больш інтэнсіўнаму пераворванню ляда і пераходу ад падсекі да пералогу, а затым і да папаравай сістэмы. Ю.А.Красноў пераканаўча абгрунтоўваў з'яўленне сахі ў паўночна-заходнім арэале ўсходніх славян, адкуль яна распаўсюдзілася на іншыя раёны ляснога земляробства. З пачатку сохі суіснавалі з раламі, але з XII–XIII стст. пачалі іх цясніць. Гэты тэрмін распаўсюджвання новай прылады – 200–300 гадоў – характэрны і для ўкаранення іншых новаўтварэнняў у сярэднявечным сялянскім асяроддзі (8).

Гэта адносіцца і да распаўсюджвання плуга. Ужо адзначалася з'яўленне пылады плужнага тыпу – рала з чарэслам у VIII–X стст. Узнікненне асноўнай адзнакі плуга – шырокага асіметрычнага наканечніка – датуецца XI–XII стст. А праз 200–300 гадоў, у XIII–XIV стст., ён распаўсюджваецца паўсюдна ў лясной зоне (9).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

У заходніх славян другая палова I тыс. таксама была перыядам панавання рала. З VII–VIII стст. адзначаюцца жалезныя асіметрычныя наральнікі, якія некаторыя тамтэйшыя даследчыкі лічаць адзнакамі існавання лёгкіх плугоў. Але гэтыя прылады суіснуюць з раламі, пакуль не выцясняюцца сапраўднымі цяжкімі плугамі з буйнымі асіметрычнымі лемехамі ў XIII–XIV стст. (10).

Тая ж карціна назіраецца ў германскіх землях на ўсход ад Рэйна. Але з VIII–IX стст. там, як таксама і ў палабскіх славян, нямецкія даследчыкі адзначаюць спарадычнае з'яўленне сапраўдных плугоў з адваламі. Распаўсюджванне ўдасканаленага плуга адзначаецца з XIII–XIV стст. што, як відаць, было агульнаеўрапейскай з'явай (11).

Такім чынам, паступовыя змены ў сістэмах земляробства, агрыкультуры і агратэхнікі на ўсіх разглядаемых абшарах адбываліся ў другой палове I тыс. досыць сінхронна. Паўсюдна пэўны час суіснавалі падсека, пералог і нерэгулярны севазварот, рала і мадэрнізаваныя прылады плужнага тыпу. І, нарэшце, паўсюдна адбываўся пераход да папаравай сістэмы з выкарыстаннем плуга, што, дарэчы, было ўзаемазвязана.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ. К сярэдзіне I тыс. ва ўсходніх славян пераважала буйная рагатая жывёла, потым – свінні, козы, авечкі, коні. Жывёла была дробнай і разводзілася на мяса (12). У VI–VII стст. у лесастэпе буйной рагатай жывёлы было ў сярэднім 39% ад усяго статку, свінняў – 36%, коз, авечак – 17%, коней – 8%. Тыя ж суадносіны захаваліся і ў VIII–IX стст., але адзначаецца павелічэнне ўдзельнай вагі буйной рагатай жывёлы і коней. З лясной зоны дадзеных меней, але вядомы наступныя суадносіны з паселішчаў Верхняга Падняпроўя і Падзвіння: буйная рагатая жывёла – каля 40%, свінні – каля 30%, козы, авечкі – каля 10%, коні – каля 12–18%. Але адзначаны і месцы з пераважаннем свіней над буйной рагатай жывёлай (поўнач Беларусі) (13).

У заходніх славян у статку таксама пераважала буйная рагатая жывёла і свінні. Але для Цэнтральнай Еўропы характэрна ваганне суадносін удзельнай вагі гэтых жывёл. Так, у польскіх землях у сярэдзіне I тыс. пераважалі каровы, а ў чэха-мараваў і ў Палаб'і – наадварот, болей было свіней. Затым у Вялікапольшчы і Памор'і павялічваецца пагалоўе свіней з 36% у VI–VII стст. (кароў – 43%) да 44% у VIII–IX стст. (кароў – 36%). На поўдзень і захад – у Малапольшчы, Сілезіі, Чэхіі, Палаб'і ў VI–VIII стст. пераважала буйная рагатая жывёла. Але і там у IX ст. свіней становіцца больш, асабліва паблізу рэзідэнцый уладароў (напрыклад, у Мікульчыцах). Такім чынам, у заходнеславянскіх землях адзначана пашырэнне распаўсюджвання свіней, што, магчыма, звязана з узрастаннем колькасці жыхароў і попыту на мяса. Свінні, якія месяцамі ў тыя часы пасвіліся ў шматлікіх дубовых і букавых лясах, лепш чым каровы пераносілі холад, не патрабавалі асаблівых памяшканняў, догляду і былі таннейшымі за кароў. Традыцыйна трэцяе месца займалі козы і авечкі. Потым – коні, якіх да распаўсюджвання рыцарства было мала (14).

У германскіх землях пачатак другой паловы I тыс. адзначаны пераважаннем свіней (15). Але затым назіраецца паступовае павелічэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы, прычым адзначаны значныя рэгіянальныя ваганні, што, трэба меркаваць, было звязана з узроўнем кармавой базы. У паўночных раёнах Германіі значную роль

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адыгрывала развядзенне коз і авечак, што таксама было абумоўлена прыроднымі ўмовамі і наяўнасцю кармоў (16).

Як бачна, у лясных абшарах Усходняй Еўропы, у славян пераважала буйная рагатая жывёла. На захадзе, у германцаў – свінні. Заходнеславянскі рэгіён адлюстроўваў спалучэнне ўсходнеславянскага складу статка з паступовым распаўсюджваннем заходніх жывёлагадоўчых традыцый. Магчыма, пераважанне буйной рагатай жывёлы ў славян было звязана з іх старажытнай айкуменай, дзе гэтаму спрыялі расліныя ўмовы. Пры рассяленні на захад, у Чэхію, Палаб'е, дзе было больш букавых і дубовых лясоў, магчыма і пад уплывам з захаду, пачаў адбывацца паступовы перагляд жывёлагадоўчых звычак. З VIII–IX стст. гэтым зменам маглі спрыяць і больш інтэнсіўныя, чым на ўсходзе, сацыяльныя пераўтварэнні са складаннем княскіх дружын, актыўных спажыўцоў свініны. Дарэчы, у старажытнарускі час і на ўсходзе пагалоўе свіней дасягнула, а месцамі (асабліва ў гарадах) нават перавысіла колькасць кароў. Хаця ёсць і адваротныя прыклады. Усё гэта сведчыць пра асаблівасці мясцовых традыцый у сутыкненні з урбанізацыяй і іншымі, новымі для ўсходу сацыяльнымі з'явамі (17).

Адрозненні ўсходу і захаду адзначаны і ў тэхніцы для назапашвання фуражу. У германцаў з IV–VI стст. распаўсюджваецца падобная на познерымскую доўгая каса (тыпу сучаснай "літоўкі"). Яна дазваляла пры адноснай зручнасці ў працы нарыхтоўваць сена больш, чым з дапамогай вядомай у славян кароткай касы (18). Магчыма, недахоп кармоў пры больш шчыльным рассяленні і стымуляваў укараненне свінагадоўлі.

РАМЯСТВО. Пачатак ягонага аддзялення ад сельскай гаспадаркі ва Ўсходняй Еўропе фіксуецца ў помніках VII–IX стст. толькі ў найбольш складанай дзейнасці – металургіі і металаапрацоўцы. На паселішчах адзначана гэтага часу з'яўляюцца спецыялізаваныя майстэрні і нават металургічныя цэнтры. Пачынаюць выдзяляцца і ювеліры. У стэпавым Падняпроўі адзначаюцца і асобныя ганчарныя майстэрні (чарняхоўскі ўплыў). Але на асноўнай усходнеславянскай тэрыторыі выраб посуду, як і іншага інвентару да рубяжа I/II тыс. працягваў заставацца ў межах хатніх промыслаў (19).

Сляды сырадутных горнаў вядомы на помніках VI–VII стст. у Сярэднім Падняпроўі і на Смаленшчыне. З улікам знаходак з жалеза на ўсіх паселішчах другой паловы I тыс., жалезаробчыя цэнтры былі і ў іншых месцах. Аднак на такіх цэнтрах звычайна не знаходзяць слядоў кавальства. Напэўна, складанасць здабычы жалеза і яшчэ няпоўнае аддзяленне ад сельскагаспадарчай дзейнасці не дазвалялі ствараць такія канцэнтраваныя вытворчасці. Тым больш што кавалі тады працавалі, у асноўным, на заказ і размяшчаліся бліжэй да спажыўцоў. (20).

Далейшы прагрэс у металургіі адзначаны ў VIII–IX стст. Вырабаў з жалеза становіцца больш. Павялічваецца іх асартымент, больш разнастайнай становіцца тэхналогія. Кавальскія майстэрні звычайна сустракаюцца не часта, але знаходкі кавальскага інвентару і шлакаў характэрны амаль для кожнага больш ці менш буйнога паселішча. І.І.Ляпушкін мяркуе, што апроч майстэрняў маглі быць і кавалі-вандроўнікі ("халодныя кавалі") (21).

У VII ст., як і кавальская, пачала выдзяляцца ювелірная справа. У цягу VIII–X стст., зыходзячы з узрастання асартыменту і колькасці рэчаў вытворчасць аздабленняў з металу

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выдзялялася ў саастойную галіну. Паколькі сляды ювелірнай і кавальскай вытворчасці звычайна сустракаліся на адных і тых жа паселішчах, можна меркаваць, што сярод рамеснікаў былі ўніверсалы, якія апрацоўвалі і чорныя, і каляровыя металы. (І.І.Ляпушкін) (22).

Пра аддзяленне ганчарства, ткацтва і іншых вытворчасцей ад паўсядзённых сялянскіх заняткаў неаспрэчных даных мала. Гэтыя вытворчасці хутчэй за ўсё яшчэ заставаліся на ўзроўні сезонных промыслаў.

Матэрыялы з заходнеславянскіх абшараў сведчаць таксама аб выдзяленні металургіі і кавальства з VII ст. (Заходняе Памор'е). У другой палове VIII – першай палове IX стст. на заходнеславянскіх паселішчах адзначаны сляды апрацоўкі каляровых металаў (23). У палабскіх славян спецыялізаваныя металургія і кавальства адзначаны з VIII ст. (24).

Пра станаўленне германскага рамяства даных мала. Але, напрыклад, у Варэндорфе (Паўночная Германія, VII–VIII стст.) кожная група двароў ужо мела свайго каваля (25).

Такім чынам, у VI–VII стст. у славян і германцаў на разглядаемай тэрыторыі назіраўся наогул аднолькавы ўзровень ва ўсіх асноўных сферах гаспадарчага жыцця. І ў далейшым як на ўсход, так і на захад ад Эльбы дзейнічалі аднолькавыя тэндэнцыі развіцця і ў земляробстве, і ў жывёлагадоўлі (26). Тыя адрозненні, якія былі адзначаны, напрыклад, у суадносінах кароў і свіней, у тыпах кос і, такім чынам, у спосабах нарыхтоўкі кармоў, у формах ворыўных прылад і некаторыя іншыя, былі другараднымі, залежылі часцей за ўсё ад натуральных акалічнасцей. У цэлым напрыканцы І тыс. па ўзроўню гаспадарчага развіцця гэтыя землі мала адрозніваліся адна ад другой.

Але затым эканамічнае развіццё германскіх зямель стала значна больш дынамічным, што, мяркуем, было звязана з асаблівасцямі грамадскага развіцця: рознымі суадносінамі ўласніцкіх правоў на зямлю – распаўсюджваннем форм асабістага землеўладання, што ішлі да алоду, на захадзе, і доўгім захаваннем абшчыннага землеўладання ў славян (27).

## СПАСЫЛКІ І ЗАЎВАГІ:

1. РИЕР Я. Г. Средневековое сельское расселение в Восточной и Центральной Европе: сравнительная характеристика // Славянская археология. 1990. Вып.3. М. 1993.

2. Древняя Русь. Город, замок, село // Археология СССР. М. 1985. С. 220; Белорусская археология. Мн. 1987. С. 73; ДОВЖЕНОК В. Й. Землеробство древньой Русі. К. 1961; КРАСНОВ Ю. А. О системах и технике земледелия в лесной полосе Восточной Европы // Советская археология. 1967. № 1; ПЕТРОВ В. П. Подсечное земледелие. К. 1968; КОРОБУШКИНА Т. Н. Земледелие на территории Белоруссии в X–XIII вв. Мн. 1979. С. 98–99; ШАДЫРО В. И. Ранний железный век Северной Белоруссии. Мн. 1985. С. 91; ШМИДТ Е. А. О земледелии в верховьях Днепра во второй половине I тыс. н. э. // Древние славяне и Киевская Русь. К. 1990; АНУЧИН В. А. Географический фактор в развитии общества. М. 1982. С. 168–169.

3. Древняя Русь, С. 220; ЛЯПУШКИН И. И. Городище Новотроицкое // Материалы и исследования по археологии СССР. 1958. № 74. С. 214; ДОВЖЕНОК В. Й. Ук. тв. С. 102–104; ПЕНЯК С. І. Ранньослов'янське та давньоруське населення Закарпаття VI–VIII ст. К. 1980; Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период. К. 1990. С.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

373; АНУЧИН В. А. Ук. тв. С. 169; КРАСНОВ Ю. А. Ук. тв. С. 107–111; ШМИДТ Е. А. Ук. тв.

4. Древняя Русь, С. 220; Археологія Украіньской РСР. Т. 3. К. 1975. С. 461–462; ЛЯПУШКИН И. И. Ук. тв. С. 213–214; ДОВЖЕНОК В. Й. Ук. тв.; Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 2. Мн. 1972. С. 65; КОРОБУШКИНА Т. Н. Ук. тв. С. 96–97; ТИМОЩУК Б. О. Слов'яни північноі Буковини V–IX ст. К. 1976. С. 103; КРАСНОВ Ю. А. Древние и средневековые пахотные орудия Восточной Европы. М. 1987. С. 162; Этнокультурная карта территории Украинской ССР в I тыс. н. э. К. 1985. С. 149; Славяне Юго-Восточной Европы... С. 374–375; ЗВЕРУГО Я. Г. Верхнее Понемонье в IX–XIII вв. Мн. 1989. С. 112.

5. PODWICSKA Z. Technika uprawy roli w Polsce њredniowiecznej. Wroclaw–Warszawa–Krakyw. 1962. S. 168–170; Studia z dziejyw gospodarstwa wiejskiego. T. 8. 1968. S. 92–102; JODOWSKI J. Dolny SlNsk na poczatku њredniowiecza. Wroclaw. 1980. S. 136–137; DOSTБL B. Zemedelska vyrobб na uzemi CSSR. v. 6.–10. st. // Arhaeologia historica. No. I. Brno. 1976. S. 11; BERANOVБ M. Zemedelstvi starэch slovanщ. Praha. 1980. S. 192–193.

6. DONAT P. Die Landwirtschaft in der Zeit der Herausbildung und Festigung des Feudalismus in Mitteleuropa // Zeitschrift fьr Geschictswissenschaft. 1983. Jg. 31. H. 8; HERRMANN J. Probleme der Fruchtwechselwirtschaft im Ackerbau des 8. bis 9. Jahrhundert am Beispil ausgefьhlter schriftlicher und arcдologischer Queller // Zeitschrift fьr Archдologie. 1981. Jg. 15. H. 1.

7. Древняя Русь, С. 221; Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1. Мн. 1970. С. 234; Археологія УРСР. С. 168; ЛЯПУШКИН И. И. Славяне Восточной Европы накануне образования Древнерусского государства // Материалы и исследования по археологии СССР. № 152. 1968. С. 136; ДОВЖЕНОК В. Й. Ук. тв. С. 56–69; Возникновение и развитие земледелия. М. 1967. С. 176–178; ПРИХОДНЮК О. М. Слов'яни на Поділлі. К. 1975. С. 50; ЧЕРНЕЦОВ А. В. К вопросу о происхождении восточноевропейского плуга и русской сохи // Вестник МГУ. Сер. историческая. 1972. № 2; РУСАНОВА И. П. Славянские древности VI–VII вв. М. 1976. С. 50; КРАСНОВ Ю. А. Древние...; Этнокультурная карта... С. 141; Славяне Юго-Восточной Европы... .

8. Древняя Русь. С. 122–124; ДОВЖЕНОК В. Й. Ук. тв. С. 83–90; Возникновение... С. 184–188; Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 2. С. 59–61; ЧЕРНЕЦОВ А. В. Ук. тв.; КОРОБУШКИНА Т. Н. Ук. тв.; КРАСНОВ Ю. А. О системах... .

9. Древняя Русь. С. 223; ДОВЖЕНОК В. Й. Ук. тв. С. 72–89; Возникновение... С. 178–180; Очерки... Ч. 2. С. 59–61; ЧЕРНЕЦОВ А. В. Ук. тв.; КРАСНОВ Ю. А. О системах...; ПОЛЕВОЙ Л. Л. Типология землепашных орудий и появление плуга на территории Молдавии // Археологические исследования памятников в Днестровско-Прутском междуречье. Кишинев. 1985. С. 68–85.

10. GIEJSZTOR A. W sprawie poczatkyw tryjpolywki w Polsce i krainach sNsednich // Prace z dziejyw Polski feudalnej. Warszawa. 1960; PODWICSKA Z. Ibid. S. 203, 359; BERANOVБ M. K otбzke systйmu staroslovanskeho zemedelstvi v druhe polovinй I tis. n. l. // Pamбtky archeologicke. 1962. R. 53. S. 199; DOSTБL B. Ibid. S. 11; NEKUDA V. Zemedelska vyroba v obdobн feudalismu na Morave // Archaeologia historica. 1985. No. 10. S. 34–37; ИAPLOVIИ D. Pol'nohospodarska vэroba na vychodnom Slovensku v obdobi stredoveku // Nove obzory. 1984. No. 26.

11. DONAT P. Ibid. S. 704; Die Slawen in Deutschland. Berlin. 1985. S. 72–73; BENTZIEN U. Bauerarbeit im Feudalismus. Berlin. 1980. S. 25–71; GRINGMUHT–DALLMER E. Frьhgeschichtliche Pflugspuren in Mitteleuropa // Zeitschrift fьr Archдologie. 1983. Jg. 17. H. 2.

12. КРАСНОВ Ю. А. О системах...

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

13. ПРИХОДНЮК О. М. Ук. тв. С. 52–63; ПЕНЯК С. І. Ук. тв. С. 115. Этнокультурная карта... С. 142–149; БАРАН В. Д. Пражская культура Поднестровья. К. 1988. С. 49; СЕДИН А. А. Древнее земледелие и скотоводство по материалам раскопок городища Никодимово // Археалогія і старажытная гісторыя Магілёўшчыны і сумежных тэрыторый. Магілёў. 1994.

14. DEMBICSKA M. Zmiany w strukturze hodowli na ziemiach polskich we wczesnym ьred-niowieczu // Kwartalnik historii kultury materialnej. 1975. No. 2; JODOWSKI J. Ibid. S. 141–149, 172; PLEINEROVБ I. Bвezno. Praha. 1975. S. 76, 99–104; BERANOVБ M. Zemedelstvi starэch slovanщ. Praha. 1980. S. 239–243, 279–281; BERANOVБ M. Zpusob chovu dobytka u slovanщ v 6.–10. stoleti // Slovanй v 6.–10. stoleti. Brno. 1980; DOSTБL B. Ibid. S. 93; Hechэ v dobe slovanskй. Praha. 1984. S. 18–51, 144; KRЬGER B. Dessau-Mosigkau. Berlin. 1967. S. 139.

15. ABEL W. Die drei Epochen der deutschen Agrargeschichte. Hannover. 1962. S. 17.

16. BENECKE N. Archдologische Untersuchungen zur Entwicklung der Haustiere in der KцrpergroЯe und Wuchsform im sьdlichen Ostseegebiet // Etnographisch-archдologische Zeitschrift. 1986. Jg. 27. H. 2.

17. Археологія УРСР. С. 167. ЛЯПУШКИН И. И. Славяне... С. 139; ЦАЛКИН В. И. Материалы для истории скотоводства и охоты в Древней Руси // Материалы и исследования по археология СССР. № 51. 1956. С. 97; ЛЯПУШКИН И. И. Городище... С. 214–215; МЕЗЕНЦЕВА Г. Г. Канівське поселення. К. 1965. С. 70; ТИМОЩУК Б. О. Ук. тв. С. 104; СЕДОВ В. В. Восточные славяне в VI–XIII вв. // Археология СССР. М. 1982. С. 238–239; ПАШКЕВИЧ Г. Г., ПЕТРАШЕНКО В. А. Землеробство і скотарство в Середньому Поднипровьі в VIII–X ст. // Археологія. 1982. № 41; Этнокультурная карта... С. 149.

18. BENECKE N. Ibid. S. 38–40.

19. ЛЯПУШКИН И. И. Славяне... С. 142–166; ТИМОЩУК Б. О. Ук. тв. С. 105–115; СЕДОВ В. В. Ук. тв. С. 242–243; Славяне... С. 376–401.

20. ПРИХОДНЮК О. М. Ук. тв. С. 65–66; ГУРИН М. Ф. Древнее железо Белорусского Поднепровья. Мн. 1967. С. 19–20.

21. ЛЯПУШКИН И. И. Славяне... С. 144–145; СЕДОВ В. В. Ук. тв. С. 240–241; Славяне... С. 382–392.

22. Археологія УРСР... С. 168–169; ЛЯПУШКИН И. И. Славяне... С. 145–147; МЕЗЕНЦЕВА Г. Г. Ук. тв. С. 98–107; СЕДОВ В. В. Ук. тв. С. 241; БАРАН В. Д. Ук. тв. С. 50; Славяне... С. 392–393.

23. JOSICSKI W. Z badac nad przemianami gospodarczymi w starszych fasach wczesnego ьredniowiecza na Pomorzu Zachodnim // Archeologia Polski. 1971. R. 16.

24. HERRMANN J. Hauptfragen, Probleme und Ergebnisse der archдologischen Frьhgeschichtsforschung in der DDR in den Jahren 1965–1970 // Berichte ьber II. Internationalen KongreЯ fьr Slawische Archдologie. Bd. I. Berlin. 1970. S. 142.

25. WINKELMANN W. Ausgrabungen in der frьhmittelalterlichen Siedlung bei Warendorf (Westfalen) // Neue Ausgrabungen in Deutschland. Berlin. 1958.

26. DONAT P. Ibid.

27. РЫЕР Я. Р. Шляхі станаўлення грамадства ў сярэднявеччы: прычыны адрозненняў і ўрокі гісторыі // Магілёўская даўніна. 1993; РИЕР Я. Г. К проблеме социального развития раннесредневековой Восточной и Центральной Европы: сравнительный анализ археологических данных // Российская археология. 1996. № 1.

Люты 1997 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**Удакладненні.**

**У артыкуле Я. Рыера на стар. 11 – 12 знойдзены тэхнічныя памылкі. Правільна трэба чытаць наступным чынам.**


5) PODWIŃSKA Z. Technika uprawy roli w Polsce średniowiecznej. Wroclaw–Warszawa–Kraków. 1962. S. 168–170; Studia z dziejów gospodarstwa wiejskiego. T. 8. 1968. S. 92–102; ŁODOWSKI J. Dolny Sląsk na poczatku średniowiecza. Wroclaw. 1980. S. 136–137; DOSTÁL B. Zemedelska vyrobá na uzemi CSSR. v. 6.–10. st. // Arhaeologia historica. No. I. Brno. 1976. S. 11; BERANOVÁ M. Zemedelstvi starých slovanů. Praha. 1980. S. 192–193.

6) DONAT P. Die Landwirtschaft in der Zeit der Herausbildung und Festigung des Feudalismus in Mitteleuropa // Zeitschrift für Geschictswissenschaft. 1983. Jg. 31. H. 8; HERRMANN J. Probleme der Fruchtwechselwirtschaft im Ackerbau des 8. bis 9. Jahrhundert am Beispil ausgefühlter schriftlicher und arcäologischer Queller // Zeitschrift für Archäologie. 1981. Jg. 15. H. 1.

10) GIEJSZTOR A. W sprawie poczatków trójpolówki w Polsce i krainach sąsednich // Prace z dziejów Polski feudalnej. Warszawa. 1960; PODWIŃSKA Z. Ibid. S. 203, 359; BERANOVÁ M. K otázke systému staroslovanskeho zemedelstvi v druhe poloviné I tis. n. l. // Památky archeologicke. 1962. R. 53. S. 199; DOSTÁL B. Ibid. S. 11; NEKUDA V. Zemedelska vyroba v obdobi feudalismu na Morave // Archaeologia historica. 1985. No. 10. S. 34–37; ČAPLOVIČ D. Pol'nohospodarska výroba na vychodnom Slovensku v obdobi stredoveku // Nove obzory. 1984. No. 26.

11) DONAT P. Ibid. S. 704; Die Slawen in Deutschland. Berlin. 1985. S. 72–73; BENTZIEN U. Bauerarbeit im Feudalismus. Berlin. 1980. S. 25–71; GRINGMUHT–DALLMER E. Frühgeschichtliche Pflugspuren in Mitteleuropa // Zeitschrift für Archäologie. 1983. Jg. 17. H. 2.

14) DEMBIŃSKA M. Zmiany w strukturze hodowli na ziemiach polskich we wczesnym średniowieczu // Kwartalnik historii kultury materialnej. 1975. No. 2; LODOWSKI J. Ibid. S. 141–149, 172; PLEINEROVÁ I. Březno. Praha. 1975. S. 76, 99–104; BERANOVÁ M. Zemedelstvi starých slovanů. Praha. 1980. S. 239–243, 279–281; BERANOVÁ M. Zpusob chovu dobytka u slovanů v 6.–10. stoletì // Slované v 6.–10. stoleti. Brno. 1980; DOSTÁL B. Ibid. S. 93; Čechý v dobe slovanské. Praha. 1984. S. 18–51, 144; KRÜGER B. Dessau-Mosigkau. Berlin. 1967. S. 139.

16) BENECKE N. Archäologische Untersuchungen zur Entwicklung der Haustiere in der Körpergroße und Wuchsform im südlichen Ostseegebiet // Etnographisch-archäologische Zeitschrift. 1986. Jg. 27. H. 2.

23) ŁOSIŃSKI W. Z badań nad przemianami gospodarczymi w starszych fasach wczesnego średniowiecza na Pomorzu Zachodnim // Archeologia Polski. 1971. R. 16.

24) HERRMANN J. Hauptfragen, Probleme und Ergebnisse der archäologischen Frühgeschichtsforschung in der DDR in den Jahren 1965–1970 // Berichte über II. Internationalen Kongreß für Slawische Archäologie. Bd. I. Berlin. 1970. S. 142.

25) WINKELMANN W. Ausgrabungen in der frühmittelalterlichen Siedlung bei Warendorf (Westfalen) // Neue Ausgrabungen in Deutschland. Berlin. 1958.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова